# КРЫВІЯ

**Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі**

**№10 Чэрвень - жнівень 2008**

**Культурна-асьветніцкая газэта**


## З Ь М Е С Т


**Беларуская Чэхія**
Вечар памяці Анатоля Сыса - ст. **1**
Літаратурная вечарына Альгерда Бахарэвіча- ст. **2**
“Калі адстойваць беларускае, дык па-беларуску!“ - ст. **3**
Стары Ольса зноў у Празе - ст. **3**
Віншаваньне - ст. **16**
Беларуская Школа ў Празе - ст. **16**

**Навіны з Бацькаўшчыны**
Улада дэманструе антынароднасьць - ст. **4**
“Ядзерны рэнэсанс“ - ст. **4**
Прэс-рэліз Маладога Фронту - ст. **4**
Міністар адукацыі Польшчы бярэ Івана Шылу пад апеку - ст. **5**
Вэтэранка Хартыі 77 шле паклон Вользе Сяньковай - ст. **5**
Гісторыя Беларусі зьнікае са школьных праграмаў - ст. **6**
Разбурэньне нясьвіскага замку - ст. **7**

**Беларусы Эўразьвязу**
Падарожжа па Гарадзеншчыне - ст. **8**

**Пагляды, Разважаньні**
Апазыцыя павінна перагледзець мэты - ст.**9**
Незалежнасьць, як працэс Адраджэньня - ст.**11**
Добрасуседзтва атрымала новы імпульс - ст.**13**

**Новыя Кнігі, Прэса** - ст. **14**

**Беларусь у Эўропе**
Эўрапэйская Народная Партыя салідарная зь беларусамі - ст. **16**

**Рознае**
Показкі - ст. **14**
Крыжаванка - ст. **15**


## Беларуская Чэхія

### Вечар памяці Анатоля Сыса

*Анатоль Сыс, выдатны беларускі паэт, пакінуў гэты сьвет 3 гады таму,4 траўня 2005 г.*

Вечарына адбылася ў Празе, у нядзею 4 траўня 2008, з наступнай праграмай:
- Бард Андрэй Мельнікаў прасьпяваў песьні на вершы Анатоля Сыса;
- “жывы” голас паэта – унікальныя аўдыязапісы яго аўтарскіх чытаньняў;
- успаміны прысутных былых сяброў паэта, і ўспаміны Славаміра Адамовіча аб ім.
- конкурс на найлепшае чытаньне паэзіі Анатоля Сыса.

Пераможцам конкурсу стаў сп. Віталь Цімошчанка, прачытаўшы верш -- *З чаго пачаць?*

Узнагародай была кніжка паэзіі А. Сыса - ЛЁН.




*“Гараць камяні ў маім вогнішчы“ -сьпявае бард Андрэй Мельнікаў.*

Вядучым вечара быў сп. Сяргей Шупа, рэдактар Радыё Свабода.

Каардынатар вечара - сп. Аўген Сідорык.

## Літаратурная вечарына Альгерда Бахарэвіча

*У нядзелю 25га траўня ў Беларускай клубоўні у Празе адбылася сустрэча зь беларускім пісьменьнікам Альгердам Бахарэвічам.*

*Альгерд Бахарэвіч нарадзіўся ў 1975 годзе ў Менску. Аўтар чатырох празаічных кнігаў, удзельнік Бэрлінскага літаратурнага калёквіюму, шэрагу літаратурных фэстываляў у Польшчы, Славеніі, Нямеччыне.*

*Паводле апытаньня інтэрнэт-парталу "Новая Эўропа", Бахарэвіч - найлепшы беларускі пісьменьнік 2006 году.*

*Ягоныя тэксты перакладзеныя на нямецкую, чэскую, украінскую, баўгарскую, славенскую мовы. З 2007 году жыве і працуе ў Гамбургу.*

Ніжэй зьмяшчаем інтэрв'ю Альгерда Бахарэвіча зь Юрасём Бушляковым, супрацоўнікам Радыё Свабода ў Празе.



**Бушлякоў:** “Учора ў Празе ты прадстаўляў фрагмэнты сваёй найнавейшай кніжкі. Хто слухаў цябе ў Празе і як прайшла гэтая міні-прэзэнтацыя?”

**Бахарэвіч:** “Так, учора ў Празе я чытаў фрагмэнты з сваёй новай кнігі, яшчэ пакуль не апублікаванай, – з раману “Сарока на шыбеніцы”. Прыйшла на сустрэчу ў асноўным моладзь. Моладзь зацікаўленая. Магчыма, упершыню я чытаў перад аўдыторыяй, людзі зь якой пакуль што зусім не знаёмыя з маёй творчасьцю. Мне здаецца, ім было цікава. Мне здаецца, што я прыдбаў новых чытачоў”.

**Бушлякоў:** “Ты сьвядома выбраў нешта інтрыгоўнае, вострасюжэтнае?”

**Бахарэвіч:** “Я спрабаваў чытаць урыўкі з розным настроем. Каб неяк і павесяліць чытача, прымусіць яго задумацца, каб і адчуць нейкую магію мовы. Я так заўсёды раблю”.

**Бушлякоў:** “Сарока на шыбеніцы” – гэта будзе такі чарговы шматпластавы твор? Я ведаю, што ты ня надта любіш адказваць на пытаньне “пра што твор?”...

**Бахарэвіч:** “У адрозьненьне ад маёй папярэдняй кнігі “Праклятыя госьці сталіцы”, гэтая спроба напісаць раман аказалася больш удалая. Мінулая кніжка – гэта былі такія штучна зьлепленыя паміж сабой апавяданьні. Гэтая спроба атрымалася лепей. Тут усё нашмат больш арганічна, тут сюжэтныя лініі пераплеценыя больш цікава. Стараемся”.

**Бушлякоў:** “Хто галоўны герой гэтай “Сарокі...”?”

Бахарэвіч: “Калі так казаць коратка, то галоўны герой – гэта дзяўчына, якая працуе недзе ў раённай адміністрацыі, у горадзе, які вельмі нагадвае Менск. І гісторыю яе жыцьця распавядае цела. Раман складаецца з 12-ці частак, і кожная частка – гэта аповед нейкай часткі цела. Не пазьбягаючы самых інтымных падрабязнасьцяў”.

**Бушлякоў:** “Самы інтымна-шчыры твой твор?”

**Бахарэвіч:** “Можна сказаць і так. Ён ужо завершаны. Ужо ў Менску падрыхтаваны макет, рыхтуецца вокладка, выдавец абяцае, што сёлета ён зьявіцца ў продажы”.

**Бушлякоў:** “Пра што пыталіся ў цябе ўдзельнікі праскай сустрэчы? Што іх найбольш цікавіла?”

**Бахарэвіч:** “Гэта даволі дзіўна, бо шмат пытаньняў было прысьвечана маёй біяграфіі: дзе вучыўся, што скончыў, дзе працаваў. Гэта было нешта кшталту допыту, але прыемны допыт. Заўсёды людзям цікава, калі ім задаюць пытаньне наконт іхнага жыцьця. Я адказаў усё вельмі шчыра. Аўдыторыі спадабалася. І былі пытаньні літаратурныя, якія тычыліся майго стаўленьня да Набокава, маёй ацэнкі сучаснай беларускай літаратуры. Добрыя былі пытаньні. Адчувалася, што не было выпадковых людзей на гэтай сустрэчы”.

**Бушлякоў**: “Ці пыталіся ў цябе, чаму жывеш у Гамбургу, ці не зьбіраесься ў Менск?”

**Бахарэвіч:** “Вось якраз “чаму” – не пыталіся. Мне здаецца, і так было зразумела. Неяк людзі, відаць, адчуваюць маё стаўленьне да гэтай дзяржавы, да Рэспублікі Беларусь. Ім і так усё зразумела”.

**Бушлякоў:** “Пакуль ты жывеш у Гамбургу, стаўленьне да Рэспублікі Беларусь, да сучасных беларускіх парадкаў не зьмяняецца?”

**Бахарэвіч:** “Не, не зьмяняецца. Хіба што мая нянавісьць становіцца больш вострай. Учора ў інтэрвію расейскай службе Чэскага радыё я нават прачытаў верш Уладзіміра Набокава на гэтую тэму, але сёньня я чытаць ня буду, бо ён па-расейску: па-расейску на “Свабодзе” я чытаць не хачу. Але сутнасьць у тым, што гэтая дзяржава, гэтая Рэспубліка Беларусь, яна зрабіла ўсё, каб не было вяртаньня”.

**Бушлякоў:** “Каб не было твайго вяртаньня ў Беларусь?”

**Бахарэвіч:** “Так. Зрабіла ўсё, што магла. Ёсьць рэчы, якія ніколі немагчыма дараваць. Я магу толькі яшчэ раз паўтарыць, што галоўнае злачынства гэтага рэжыму – ён забіў мае мары. Гэта самае страшнае, калі ў чалавека забіваюць ягоную мару. Ён проста зьнішчыў тую краіну, у якой я зьбіраўся жыць, пра якую я марыў калісьці, на пачатку 1990-х. Я вельмі добра памятаю той час і той уздым”.

**Бушлякоў:** “Ты можаш сказаць, што на сёньняшні дзень абжыўся ў Гамбургу, што гэта тое месца, дзе можна жыць далей?..”

**Бахарэвіч:** “Гэта тое месца, дзе можна жыць далей, але ў Гамбургу я яшчэ не абжыўся. Наадварот, маё становішча вельмі хісткае і няпэўнае, бо, пакуль мяне падтрымліваюць нямецкія літаратурныя арганізацыі і фонды, я магу там жыць, але некалі гэтая дапамога скончыцца. Давядзецца прымаць тыя правілы гульні. І гэта будзе даволі цяжка. Але я кажу, што ў Беларусі адчуваў сябе заўсёды чужым. У Нямеччыне я таксама адчуваю сябе чужым. Прынцыповай розьніцы тут няма. Гэта нармальны стан для пісьменьніка – такая адчужанасьць”.

**Бушлякоў:** “Няма жаданьня знайсьці краіну, у якой бы ты адчуваў сябе ну трошкі больш сваім?”

**Бахарэвіч:** “Я думаю, такой краіны насамрэч не існуе. Мая краіна заўсёды ўва мне, са мной. Я такі смоўжык з сваёй хаткай заўсёды. Не, гэта нармальна”.

**Крыніцы :** Жывы Журнал “Беларуская Прага,“ Радыё Свабода.

---

## “Калі адстойваць беларускае, дык па-беларуску!”

Аляксандар Уліцёнак, Радыё Свабода, 19 траўня 2008 г.

*Грамадзкія рэдактары гэтага тыдня – Ірына і Леанід Каткоўскія, бацькі нашага калегі Ўладзімера Каткоўскага, жыцьцё якога трагічна абарвалася ў выніку аўтакатастрофы. Уладзя памёр летась 25 траўня, пасьля амаль году змаганьня за жыцьцё.*

*Уладзімер Каткоўскі – адзін з заснавальнікаў беларускай Вікіпэдыі, стваральнік сайтаў www.pravapis.org, www.martyralog.org. У гонар сына Ірына і Леанід Каткоўскія заснавалі спэцыяльную прэмію, каб адзначаць найлепшыя інтэрнэт-праекты. Сёньня доктар фізычна-матэматычных навук Леанід Каткоўскі расказвае пра погляды свайго сына на беларускі інтэрнэт.*




*Сьв. памяці Ўладзя Каткоўскі*

**Уліцёнак:** Спадар Леанід, давайце яшчэ раз вернемся да прэміі імя вашага сына, якая называецца “За беларускасьць”. Чаму менавіта так?

**Каткоўскі:** Ідэя гэтай прэміі ўзьнікла амаль адразу, як Валодзя сышоў з жыцьця. Мы б хацелі захаваць тую вялікую частку ягонай працы, якую ён вёў менавіта ў беларускай частцы інтэрнэту, каб яна кімсьці працягвалася. Гэтым наш сын жыў, адстойваючы свае прынцыпы і погляды ў інтэрнэце. Гэта яму найбольш балела. Прапагандаваў мову, намагаўся даваць аб’ектыўную інфармацыю пра Беларусь, каб пра яе ведалі ўва ўсім сьвеце.

**Уліцёнак:** А што Ўладзю найбольш хвалявала ў беларускім інтэрнэце?

**Каткоўскі:** Па-першае, павялічэньне колькасьці беларускамоўнай інфармацыі. Мы разам лічылі, што мова аб’ядноўвае людзей. **І калі адстойваць нешта беларускае – дык па-беларуску!**

**Уліцёнак:** Як ён ставіўся да Вікіпэдыі – разумеў, наколькі важную справу запачаткоўваў разам зь сябрамі?

**Каткоўскі:** Спачатку ідэя гэтага праекту яму не спадабалася, але потым ён ацаніў яе надзвычай высока. Напісаў і адрэдагаваў для гэтай энцыкляпэдыі вельмі шмат артыкулаў, па-беларуску і па-ангельску, больш за 1300 толькі па-беларуску, а на ангельскай мове яшчэ больш.

**Уліцёнак:** Вы прапанавалі журналістам “Свабоды” падрыхтаваць перадачу на тэму “Ці можа інтэрнэт стаць сродкам аб’яднаньня нацыі?”. Ваш адказ на вашае ж пытаньне...

**Каткоўскі:** Ён павінен ім стаць. Калі цяпер гэтага не відаць, то гадоў праз дзесяць-дваццаць – абавязкова. Жыцьцё будзе рухацца менавіта ў гэтым напрамку. Бо інтэрнэт – найсучасны сродак масавай інфармацыі, адпаведна, ён мае эфэктыўна ўзьдзейнічаць на людзей. Тут у адным, як кажуць, і мова, і крыніца інфармацыі. Прычым свабодная, дзе людзі пачуваюць сябе вольнымі.

**Уліцёнак:** І Ўладзя працаваў менавіта з такім адчуваньнем?

**Каткоўскі:** Ён вельмі спадзяваўся, што інтэрнэт кансалідуе беларускую нацыю. І ён ужо кансалідаваў тую моладзь, якая актыўна прысутнічае ў байнэце. Гэта вельмі важна, і гэта дасьць плён: аб’яднае людзей і дазволіць прыйсьці да той незалежнасьці, пра якую мы марым.

---

## Стары Ольса зноў у Празе!




6 чэрвеня 2008 г., у клюбе ВАГОН, адбыўся сёлета ўжо другі канцэрт гурта СТАРЫ ОЛЬСА, які выканаў музыку **ШЛЯХОЦКІХ ДВАРОЎ** беларускага сярэднявечча.

Праграму канцэрту ўзбагаціў чэскі гурт **Dick’o Brass**, выкананьнем музыкі старажытных Кельтаў: Брэтонцаў, Шкотаў, Ірляндцаў.

## НАВІНЫ з Бацькаўшчыны

### Улада дэманструе сваю антынароднасьць

Удзельнікаў пратэсту супраць пабудовы хімзаводу звальняюць і судзяць. На думку лідэра Руху “За Свабоду” Аляксандра Мілінкевіча, ціск на людзей набыў беспрэцэдэнтныя формы. Улада канчаткова адарвалася ад народу.

Сёньня ў судзе Пухавіцкага раёну Менску распачынаюцца слуханьні адносна былых настаўніц з пасёлку Дружны Насты Паповай і Таццяны Дыльковай. Яны былі ўдзельніцамі мітынгу жыхароў пасёлку, якія пратэставалі 25 красавіка супраць будаўніцтва ў гэтай мясцовасьці заводу ядахімікатаў расейскай фірмы “Аўгуст-Бел”, паведамляе Радыё Свабода. Да гэтага жанчын вымусілі напісаць заявы аб звальненьні па ўласным жаданні за ўдзел у мітынгу пратэсту супраць пабудовы заводу.

За ўдзел у гэтым жа мітынгу інжынеру ЦЭЦ-5 Тацьцяне Рысевец пракуратура Пухавіцкага раёну вынесла афіцыйнае папярэджаньне, якое яна спрабуе абскардзіць ў пракуратуры Менскай вобласці. Паводле Рысевец, улады таксама ціснуць на жыхароў Дружнага, якія паставілі свае подпісы пад зваротам у ААН, АБСЭ і да кіраўніка краіны.

Як бачна, на людзей, якія занялі актыўную грамадзянскую пазіцыю, ціснуць ўсімі магчымымі спосабамі. На думку лідэра Руху “За Свабоду” Аляксандра Мілінкевіча улада канчаткова адарвалася ад народа.

– Ціск на грамадзянскую супольнасьць набыў беспрэцэдэнтныя маштабы. Людзі ня вылучаюць палітычных лозунгаў, не патрабуюць адстаўкі прэзідэнта. Яны адстойваюць свае элементарныя правы на чыстае паветра, ваду, зямлю для сябе і сваіх дзяцей. Клопат пра гэта – абавязак дзяржавы. На гэты конт ня можа быць аніякіх дыскусіяў. Але беларускі рэжым настолькі аддаліўся ад народу і ягоных патрэбаў, што гатовы падаўляць любую актыўнасьць грамадзян, абараняючы інтарэсы нікому не вядомых, набліжаных да улады бізнэс-груповак, – лічыць Аляксандр Мілінкевіч.

**Крыніца:** Прэсавая служба Руху “За Свабоду,“ 05.06.2008

---

### Сямашка кажа пра “ядзерны рэнэсанс”

Віцэ-прэм’ер Уладзімір Сямашка адказаў актывістам горацкай антыядзернай групы на ліст, дзе выказвалася нязгода з будаўніцтвам АЭС у Беларусі.

Актывісты Руху “За Свабоду”, якія стварылі антыядзерную групу, прыклалі да ліста, накіраванага ва ўрад, 1000 подпісаў жыхароў рэгіёну, якія выказвалі сваю катэгарычную нязгоду з пабудовай атамнай станцыі.

Яшчэ 1 сакавіка падчас дэпутатцкай справаздачы сабраныя дакументы былі перададзены дэпутатцы Палаты прадстаўнікоў Тацьцяне Асмалоўскай, якая абяцала іх перадаць у Савет міністраў.

Сямашка ў сваім лісьце адзначае, што пабудова АЭС дазволіць забясьпечыць 30% патрэбы краіны ў электраэнергіі. Доля прыроднага газу які амаль увесь расейскі, складае 95% у беларускай энергасістэме, што стварае пэўныя праблемы для забеспячэньня энергетычнай бяспекі. Па словах віцэ-прэм’ера, пастаўкі ядзернага паліва маюць больш магчымасьцяў для дыверсіфікацыі. Будаўніцтва АЭС нібыта дасць імпульс эканамічнаму развіцьцю рэгіёну. На думку Сямашкі, ва ўсім свеце зараз назіраецца “рэнэсанс ядзернай энергетыкі”. Першы намесьнік прэм’ера запэўнівае ў бясьпецы сучасных рэактараў, іх большай экалагічнасьці. Ён прыводзіць дадзеныя сацыялагічнага маніторынгу, паводле якіх нібыта больш за 50% беларусаў падтрымліваюць пабудову АЭС, а на Магілёўшчыне такую ідэю ўхваляюць больш за 60% насельніцтва.

– Такі адказ нас ня можа задаволіць. Мы таксама вывучалі стаўленьне жыхароў нашага рэгіёну да будаўніцтва АЭС і я магу сказаць, што лічбы, прадстаўленыя ў лісьце Сямашкі не адпавядаюць рэчаіснасьці. Паводле нашых дадзеных, больш за 60% жыхароў Магілёўшчыны выступаюць як раз супраць пабудовы АЭС. Збор подпісаў супраць атамнай станцыі актыўна працягваецца. Зараз іх сабрана ўжо 2520, – паведамляе актывіст Руху “За Свабоду” Эдуард Брокараў.

**Крыніца:** Прэсавая служба Руху “За Свабоду,“ 24.06.2008

---

### Прэс-рэліз Маладога Фронту

**13 траўня 2008 году у Вільні (Літоўская Рэспубліка) у беларускім цэнтры “Дом правоў чалавека” адбылося ўрачыстае падпісаньне пагадненьня аб супрацоўніцтве і ўзаемападтрымцы паміж Маладым Фронтам і Маладымі Хрысьціянскімі дэмакратамі Літвы.**

Ад імя Маладога Фронту пагадненьне падпісаў намесьнік старшыні МФ Артур Фінькевіч, ад імя Маладых Хрысьціянскіх дэмакратаў Літвы Інга Аўгунене.

Сваім пагадненьнем партнэры выказаліся за супольныя акцыі, якія будуць спрыяць развіцьцю дэмакратычнага шляху ў краінах нашага рэгіёну. Апроч таго, паводле пагадненьня, Малады Фронт і Маладыя Хрысьціянскія дэмакраты Літвы будуць актыўна супрацьстаяць імпэрскім выпадам з боку Расеі, якая сёньня агрэсіўна прасоўвае ідэі падпісаньня канстытуцыйнага акту Беларусі з Расеяй, які пагражае дзяржаўнаму суверэнітэту нашай краіны і бліжэйшым эўрапейскім суседзям.

Гэтая падзея прыцягнула вялікую ўвагу літоўскіх сродкаў масавай інфармацыі, прадстаўнікі якіх прысутнічалі на ўрачыстым падпісаньні і прэсавай канферэнцыі. З боку літоўскіх журналістаў гучала шмат пытаньняў пра практычныя пэрспэктывы пагадненьня, пра бліжэйшыя сумесныя акцыі, а таксама пра сітуацыю ў Беларусі і пляны Маладога Фронту датычна бліжэйшых палітычных падзеяў.

Арганізацыяй мерапрыемства з Літоўскага боку займаўся Вайдас Аўгунас, Віцэ-прэзідэнт “Моладзі Еўрапейскай народнай партыі” і прадстаўнік Маладога Фронту ў Літоўскай Рэспубліцы Кірыл Атаманчык.

Таксама на прэсавай канфэрэнцыі прысутнічаў першы сакратар амбасады ЗША ў Беларусі сп.Луіс Крышак, нядаўна аб’яўлены пэрсонай нон-грата ў Беларусі, прадстаўнікі МЗС Чэскай і Літоўскай Рэспублікі.

Напрыканцы размовы з журналістамі, Артур Фінькевіч заявіў, што Малады Фронт пасьлядоўна выступае за стварэньне Балта-Чарнаморскай супольнасьці правацэнтрысцкіх моладзевых арганізацыяў, і цягам бліжэйшага часу будзе актыўна разьвіваць дачыненьні з міжнароднымі партнэрамі як з гэтага рэгіёну, так і наагул з усімі чальцамі "Моладзі Еўрапейскай Народнай партыі", сталым назіральнікам якой зьяўляецца Малады Фронт.

Пасля прэсавай канферэнцыі Артура Фінькевіча запрасілі на некалькі радыёстанцыяў, якія зрабілі некалькі інтэрвію пра сітуацыю у Беларусі і пра бліжэйшыя пляны Маладога Фронту.

Датычна бліжэйшых палітычных плянаў Маладога Фронту Артур Фінькевіч заявіў, што незалежна ад пазіцыі іншых палітычных суб'ектаў Беларусі, Малады Фронт заклікае ўсіх неабыякавых грамадзянаў нашай краіны ў дзень парламэнцкіх выбараў, 28 верасьня, у 20.00 прыйсьці на плошчу Каліноўскага, каб абараніць права свабоднага выбару і выказаць свае стаўленьне да псэўдавыбараў у Беларусі.

Неабходна адзначыць, што раніцай 13 траўня, калі Артур Фінькевіч рухаўся на аўтамабілі з калегамі праз дзяржаўную беларуска-літоўскую мяжу (Каменны Лог), беларускія мытнікі паспрабавалі ня пусьціць яго праз мяжу, матываваўшы свае імкненьне тым, што ягонае прозьвішча значыцца ў базе часова невыязных з Беларусі. Сітуацыю выратаваў адзін з кіраўнікоў памежнага пераходу, які прыняў асабістае рашэньне прапусьціць Фінькевіча праз мяжу.

Уначы з 13-га на 14-е траўня, калі Артур Фінькевіч з калегамі вяртаўся ў Беларусь, беларускія мытнікі, толькі ўбачыўшы пашпарт Фінькевіча пры пашпартным кантролі, выклікалі ўсіх кіраўнікоў мытнага пункту. Як высьветлілася, на гэты момант ва ўсіх супрацоўнікаў мытні была задача спыніць Фінькевіча, афіцыйна праінфармаваць яго пра тое, што ён зьяўляецца часовы невыязным зь Беларусі і паставіць яму адпаведную пячатку ў пашпарце.

Фінькевіча правялі ў кабінет мытнага пункту, дзе адзін з кіраўнікоў пераходу паведаміў яго, што з 25 красавіка 2008 году ён зьяўляецца невыязным, і паставіў яму пячатку у пашпарце аб тым, што ён часова пазбаўлены права пакідаць Беларусь.

Артур Фінькевіч наступным чынам пракамэнтаваў дадзеную сітуацыю: "Я лічу, што дадзеная акцыя была сплянаваная беларускімі спэцслужбамі, якія, праслухоўваючы нашыя перамовы, ведалі пра заплянаванае падпісаньне пагадненьня і пра шэраг іншых важных сустрэчаў у Вільні. Такім чынам, яны зьбіраліся сарваць падпісаньне пагадненьня і заплянаваныя сустрэчы. Я вельмі ўдзячны таму супрацоўніку мытні, які прыняў рашэньне мяне прапусьціць у Літву, і ўпэўнены, што з кожным днём нашых людзей ва ўсіх структурах становіцца ўсё больш!"

***Прэсавая служба Маладога Фронту*, 14.05.2008**

# Міністр адукацыі Польшчы бярэ Івана Шылу пад сваю апеку

**Міністр адукацыі Польшчы Катажына Халь запрасіла маладафронтаўца, актывіста Руху "За Свабоду" Івана Шылу, якога беларускія ўлады не дапусьцілі да апошняга выпускнога экзамену ў школе, працягнуць навучаньне ў Польшчы і абяцала яму дапамогу ў атрыманьні далейшай адукацыі.**

- Выключэньне вучня са школы перад апошнім выпускным экзаменам зьяўляецца беспрэцэдэнтным выпадкам. Згодна з дэмакратычнымі стандартамі, грамадзкая актыўнасьць, дзейнасць па распаўсюджваньні культуры і мовы свайго народу ня могуць зьяўляцца перашкодай у прадаўжэньні навучаньня ці атрыманьня атэстату аб сярэдняй адукацыі - адзначыла ў сваім лісьце міністр адукацыі.

Катажына Халь заявіла, што ўсе вучні, якія апынуцца ў такой сітуацыі, змогуць працягнуць навучаньне ў польскай сярэдняй школе і атрымаць там атэстат.

Пра выпадак з Іванам Шылам і сваю рэакцыю на яго Катажына Халь паінфармавала еўрапейскіх міністраў адукацыі падчас нефармальнай канферэнцыі, прысьвечанай праблемам міжкультурніцкай адукацыі, якая адбывалася ў Осла (Нарвэгія).

**Крыніца:** Прэсавая служба Руху "За Свабоду," 12.06.2008

# Вэтэранка Хартыі-77 шле паклон Вользе Сяньковай

***Алена Ціхановіч**, Радыё Свабода, 05.06.2008*

*Ці павінен пэдагог, выкладчык, прафэсар заступацца за сваіх вучняў і студэнтаў, якім пагражае несправядлівы перасьлед? Якія ён можа для гэтага абраць сродкі, або, наадварот, якія прывесьці апраўданьні сваёй пасіўнай згоды з перасьледам? Дылема выбару асабліва востра стаіць ва ўмовах таталітарных рэжымаў. Свайго роду погляд на мінулае і яго ўрокі – у размове з колішняй чэскай дысыдэнткай, актыўнай удзельніцай Хартыі –77 Данай Немцавай.*

*У часы дзейнасьці Хартыі-77 спадарыня Немцава займалася ў тым ліку і абаронай несправядліва перасьледаванай моладзі. З-за сваёй праваабарончай актыўнасьці яна, псыхоляг паводле адукацыі, не магла працаваць па спэцыяльнасьці, была прыбіральшчыцай і вахцёршай. Дана Немцава – маці семярых дзяцей. Зь іх толькі чацьвёра атрымалі атэстат аб заканчэньні сярэдняй школы. У часы камунізму ніхто зь дзяцей Даны Немцавай ня мог вучыцца ў вышэйшых навучальных установах і, толькі даганяючы пазьней страчаныя магчымасьці, адна з дачок ужо пасьля сарака гадоў атрымала юрыдычную адукацыю.*

**Немцава:** У часы таталітарызму і Хартыя-77 займалася праблематыкай дзяцей, якія з розных прычынаў былі для рэжыму нязручнымі. Мы вельмі цьвёрда выступалі супраць таго, каб дзеці былі караныя за сваіх бацькоў або за сваю ўласную пазыцыю, асабліва тыя старэйшыя, якія ўжо мелі крытычныя погляды. Успамінаю на выпадак, калі хлопца выключылі са школы - было яму 18 гадоў, і гэта азначала, што мог ужо падпісаць Хартыю-77. Выключылі яго пасьля

ціску паліцыі і спэцслужбаў. Такіх выпадкаў было, вядома, болей. Былі , між тым, таксама школы, дзе выкладчыкі, пэдагагічны калектыў проста станавіліся на бок вучня, але не дэманстратыўным спосабам. Так, напрыклад, удалося маёй дачцы атрымаць атэстат, нягледзячы на тое, што на школу аказваўся ціск. Так што шмат залежала ад сьвядомасьці, ад пазыцыі таго пэдагога.

**Карэспандэнт:** А ці часта пэдагогі выбіралі прасьцейшы, нерызыкоўны для сябе варыянт?

**Немцава:** Ведаю, што ціск на пэдагогаў аказваўся самымі рознымі спосабамі. Ведаю, што яны часта апраўдваліся тым, што калі б адыйшлі, то не далі б сваім студэнтам тыя веды, якія маглі даць. Было гэта складана. Нехта гэтаму ціску падпарадкаваўся, гэта было вельмі частае рашэньне - не рабіць сабе большых праблемаў, а разглядаць крытычную пазыцыю маладога чалавека як нейкую крайнюю праяву маладосьці. Старэйшыя выкладчыкі часта былі перакананыя, што асабістымі паводзінамі ці асабістай мужнасьцю нічога ня зьменіш, але прытым насамрэч гэта зусім наадварот. Асабістая мужнасьць - гэта якраз той спосаб, якім можна процістаяць таталітарнаму ціску.

**Дырэктарцы жадаю моцнай адвагі і веры ў тое, што ўсё яшчэ павернецца да лепшага**

**Карэспандэнт:** Якое Ваша пасланьне героям нашай гісторыі ў Салігорску?

**Немцава:** Я з вялікай павагай паставілася да ўчынку вашай дырэктаркі Вольгі Сяньковай, якая змагла пакінуць сваю пэдагагічную працу і выказаць салідарнасьць з хлопцам, якому не дазволілі закончыць вучобу. Вядома, жадаю таму хлопцу неўзабаве закончыць школу , а дырэктарцы - моцнай адвагі і веры ў тое, што гэта не канец усяму, і што ўсё яшчэ павернецца да лепшага.




*Вольга Сянькова*

## ПАДЗЯКА

Рэдакцыя выражае шчырую падзяку
сп. Віталю Цімошчанку
за фінансавую дапамогу пры раздрукаваньні
гэтага нумару газэты.

# "Гісторыя Беларусі" зьнікне са школьнай праграмы

**Наста Ігнатовіч**

*Курс "Гісторыі Беларусі" ў нашых школах выкладацца больш ня будзе. Гэта чарговы лагічны крок пасьля таго, як прадмет пачалі выкладаць па-руску. У праекце вучэбнага плану на наступны год напісана проста - "гісторыя". Для новага прадмету рыхтуецца і адмысловы падручнік.*

Такую інфармацыю пацьвердзіла Еўрарадыё намесьніца начальніка упраўленьня агульнай сярэдняй адукацыі Мінадукацыі Валянціна Маеўская. Па словах чыноўніцы, цяпер працуе міжведамасная камісія, якая абмяркоўвае пытаньне пра аб'яднаньне двух прадметаў з новага навучальнага году:

"Адно з пытанняў - гэта зацвярджэньне вучэбнага плану, у якім гэты прадмет будзе называцца "Гісторыя". Ну, ён будзе складацца з двух частак. І выдзяляецца дзьве гадзіны. Адна гадзіна на гісторыю Беларусі, другая - на сусьветную гісторыю. І так, як было, так і застаецца. Проста ў вучэбным плане ён будзе называцца "Гісторыя".

Новы вучэбны план стане дадаткам да дэкрэту аб пераходзе на 11-гадовы тэрмін навучаньня ў школах. Пра гэта Еўрарадыё расказаў старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Здановіч. План "задавальняе ўсіх". А колькі дакладна гадзінаў будзе адведзена на гісторыю Беларусі ў агульным курсе гісторыі, Здановіч ня ведае:

"Я ня ведаю, тут проста напісана "гісторыя", таму тут я не магу растлумачыць ці то будзе гісторыя сярэдніх вякоў… і колькі гадзінаў на гісторыю Беларусі. Проста напісана слова "гісторыя". У прынцыпе, калі мы ўчора абмяркоўвалі план, то ён задаволіў усіх".

Закрануць змены нават старэйшыя класы, якія ў сувязі з пераходам на 11-годку, школу будуць заканчваць у "экстрэмальных умовах"

Здановіч: "Нават у пераходным тыповым вучэбным плане для тых 9-10 класаў, якія знаходзяцца цяпер у школе, і якія будуць у такім экстрэмальным рэжыме заканчваць школу, нават у іх напісана гісторыя 2 гадзіны".

Настаўніца гісторыі мінскай Гімназіі №12 Вольга Шаўцова пра надыходзячыя змены ведае. Кажа, што нібыта нават існуе адмысловы падручнік для новага прадмету. Праўда рыхтаваўся ён пад 12-годку:

"Я пра гэта чула, я ведаю, што ёсьць падручнікі, іх ужо падрыхтавалі. І там гісторыя ідзе як інтэграцыйны курс. Гэта значыць, што ў адным падручніку пасьлядоўна будзе выкладацца гісторыя сусьветная…. ну і гісторыя Беларусі, калі гэтыя працэсы ахопліваюць нашу тэрыторыю. Падручнік будзе адзін, але ён быў падрыхтаваны для 12-гадовай школы. Што будзе цяпер з пачатку верасьня, я ня ведаю".

Вольга Шаўцова расказвае, што з настаўнікамі гісторыі наконт аб'яднаньня двух прадметаў ніхто ня раіўся. Але, магчыма, гэта і добрая ідэя, калі б толькі рабілася трошкі па-іншаму — настаўнікі былі супраць выкладаньня гісторыі роднай краіны па-руску:

"У нас ня пыталіся пра тое, ці трэба аб’ядноўваць гэтыя курсы. Тым ня менш многія былі згодныя, але не ў такім ракурсе. Мы, напрыклад, былі супраць таго, каб гісторыя Беларусі выкладалася на рускай мове. Настаўнікі гісторыі ўсё ж такі выступаюць за тое, каб гісторыя Беларусі выкладалася на роднай мове".

Не зразумела, чаму і каму ўсё ж такі спатрэбілася аб’яднаць "Сусветную гісторыю" зь "Гісторыяй Беларусі". Настаўнікі і надалей маглі выкладаць гісторыю нашай краіны "комплексна". Як тое рабіла Вольга Шаўцова. Без агульнага падручніка:

"Наагул гэта такі культурна-цывілізацыйны падыход. З гэтага пункту гледжаньня, гэта абсалютна правільна. Я, напрыклад, у любым выпадку працую сінхронна, хоць і не па інтэграцыйным падручніку. Я даю курс "сусьветкі" і пасля разглядаю, якія працэсы адбываліся ў Беларусі, і як гісторыя сусьветная паўплывала на гэтыя працэсы ў нашай краіне".

Вядомы пісьменнік і гісторык Уладзімір Арлоў называе такі крок спробай ператварыць нашу гісторыю з тысячагадовай у вельмі кароткую. Ня выключае ён і таго, што чыноўнікі пойдуць на скарачэньне гадзінаў, адведзеных на гісторыю Беларусі:

"Гістарычная памяць - гэта вялікая стваральная сіла, і гэта выдатна разумее любая ўлада. Ну, а наша ўлада гэтай сілы папросту баіцца. Мы ўжо ня першы год назіраем спробы ператварыць нашу гісторыю з тысячагадовай ў гісторыю вельмі кароткую, якая пачынаецца можа толькі ў 20-м стагодзьдзі. Гэта чарговы крок. Мы зьяўляемся сведкамі рэдагаваньня гісторыі, якую падпарадкоўваюць ідэалагічным нормам. Не выключана, што будуць скарачаць гадзіны…"

Адзначу, што аб’яднаньне гісторыі Беларусі з сусветнай гісторыяй - зьява ня новая. Гэты крок вяртае нас у савецкія часы. Калі існаваў толькі адзін прадмет "Гісторыя", і выкладаўся па-руску.

**Крыніца:**
Еўрапейскае радыё для Беларусі,15. 6. 2008




## Уладзімер Папруга: Толькі выключэньне Нясьвіскага замку са Сьпісу ЮНЭСКА здолее спыніць разбурэньне

**«НН»:** Спадару Папруга, калі меркаваць па здымках, зробленых у Нясьвіскім замку, там адбываецца не рэстаўрацыя, а нешта іншае…

**Уладзімер Папруга:** …І яно шакуе ня толькі людзей, далёкіх ад рэстаўрацыі, але і спэцыялістаў.

Сапраўдную рэстаўрацыю падмяняюць разбурэньнем і стварэньнем макетаў — цалкам з сучасных матар’ялаў. Рэстаўрацыя падмяняецца імітацыяй. Тое самае робіцца ў гістарычным цэнтры Менску. Зьнішчаецца аўтэнтыка каштоўнасьці — зьнішчаецца і сама каштоўнасьць.

**«НН»:** Але Нясьвіскі замак унесены ў сьпіс Сусьветнай культурнай спадчыны, куды ўключаюць толькі аўтэнтычнае.

**УП:** Нясьвіскі замак (разам зь Мірскім і Белавескай пушчай) мае ў гэтым сьпісе катэгорыю 0. Але калі «спосаб» рэстаўрацыі праз падмену стаў нормай, то на належнасьць аб’екту да сьпісу ЮНЭСКА ўвага папросту не зьвяртаецца.

Нясьвіскаму замку ня дзьве тысячы год, як помнікам Рыму, што і цяпер знаходзяцца ў зайздросным стане. Гэты замак ніколі ня быў у руінах, на працягу ўсёй сваёй гісторыі ён актыўна ўжываўся. І раптам аказваецца, што яго трэба разбурыць, бо немагчыма ўтрымаць! Гэта папросту шулерства. У любой краіне разабрацца ў гэтай гісторыі было б справай Пракуратуры ці Камітэту дзяржаўнага кантролю. У гэтым сюжэце ёсьць ўсё: ад дэзынфармацыі дзяржаўных наглядных органаў, эквілібрыстыкі з матывацыяй да падробкі праектных матэрыялаў.



**«НН»:** Але ў выпадку замены часткі Нясьвіскага замку макетам - гэта нагода для ЮНЭСКА выключыць аб’ект са Сьпісу.

**УП:** І я асабіста толькі б вітаў такое рашэньне. Лічу, што гэтай справе трэба надаць міжнародны розгалас. На жаль, гэта адзіны спосаб спыніць нарэшце Мінкультуры. Парушана ўсё, што можна сабе ўявіць — працэдура, мэтадалёгія, нарматыўная база.

Я асабіста перакананы, што калі б нарэшце ўдалося данесьці да кіраўніка дзяржавы ўсю праўду аб тым,

што насамрэч сёньня адбываецца з культурнай спадчынай, гарантам захаваньня якой зьяўляецца дзяржава, ён быў бы моцна расчараваны. Сёньня ўвесь працэс абыходжаньня з гісторыка-культурнай спадчынай стараньнямі Мінкультуры проста выведзены з прававога поля, а данесьці адэкватную пазыцыю да вышэйшага кіраўніцтва праз «легальныя» СМІ, на жаль, немагчыма.

Заўважце, калі на пачатку 90-х гадоў у Беларусі сьпісы гісторыка-культурных каштоўнасьцяў налічвалі каля 19 тысяч аб'ектаў, то ўжо сёньня — толькі каля пяці тысяч. Нават Замчышча ў складзе гістарычнага цэнтру Менску, у 2006 годзе было пазбаўлена сваёй найвышэйшай катэгорыі.

Гутарыла **Наталка Бабіна**

***Уладзімер Папруга*** *- архітэктар, былы галоўны дзяржаўны інспэктар па ахове спадчыны Менгарвыканкаму, гадаванец ICCROM (міжнароднай інстытуцыі, створанай пад патранатам ЮНЭСКА ў 1959 у Рыме як галоўны мэтадычны цэнтар для кансультаваньня апошняй ў дачыненьні да гісторыка-культурнай спадчыны), ляўрэат Прэміі прафсаюзаў БССР у галіне архітэктуры.*

**Крыніца**: *Наша Ніва,* 15 траўня 2008

## За Менск для людзей

***4 ліпеня ў Мінску па ініцыятыве Руху "За Свабоду" адбыўся сход прадстаўнікоў лакальных грамадзянскіх ініцыятыў у абарону правоў гараджан.***

Неабходнасць у стварэнні ініцыятыў з'явілася пасля пашырэння практыкі ўшчыльненых забудоў у жылых мікрараёнах, знішчэння зялёных масіваў пад выглядам добраўпарадкавання, "экскаватарнай рэканструкцыі" помнікаў архітэктуры, якія адбываюцца са згоды гарадскіх уладаў. Людзі пачынаюць разумець, што чыноўнікі не хочуць бараніць іх правы, і намераны адстойваць іх самі. Яны звярнуліся у Рух "За Свабоду" па арганізацыйную ды юрыдычную падтрымку, які і дапамог правесці сход.

Грамадзянскія ініцыятывы, якія ўзніклі ў шасці раёнах сталіцы (Паўднёвы Захад, Малінаўка, Уручча, Сухарава, Усход і іншыя), маюць на мэце абарону правоў мінчукоў на ўтульны і камфортны асяродак, чыстую пітную ваду і паветра, бясплатныя паркоўкі для машын жыхароў, змагаюцца за паляпшэнне сацыяльна-побытавых умоў для тых, хто жыве ў "спальных" раёнах.

– На сёння ў жыллёвай гаспадарцы Мінска вельмі шмат праблемаў, на якія зачыняе вочы ўлада. Мы вымушаны пастаянна рабіць грамадзянскі ціск на чыноўнікаў, каб гэтыя праблемы вырашаліся. Напрыклад, у Сухарава, дзякуючы намаганням актывістаў было завершана будаўніцтва палiклінікі. Зараз у нас ды іншых раёнах Мінску вядзецца бяздумная забудова зялёных зонаў, у выніку якой пагаршаецца якасць асяродка і ўмовы жыцця людзей, – кажа прадстаўнік грамадзянскай ініцыятывы Сухарава Алесь Лагвінец.

Удзельнікі сходу дамовіліся аб стварэнні Каардынацыйнай Рады, каб абменьвацца досведам і дапамагаць адзін аднаму вырашаць арганізацыйныя, юрыдычныя і іншыя пытанні, якія могуць узнікаць падчас дзейнасці ініцыятыў. Сябры ініцыятыў заклікаюць далучацца да іх дзейнасці ўсіх жадаючых жыхароў сталіцы.

**Крыніца:** Прэсавая служба Руху "За Свабоду," 07.07.2008

## Беларусы Эўразьвязу

# ПАДАРОЖЖА ПА ГІСТАРЫЧНАЙ ГАРАДЗЕНШЧЫНЕ

*"Каб было ўсё гучней і ўрачысьцей,*
*Ня тлуміся, рабі ўсё прасьцей:*
*Пляц расквецъ, ды трыбуну начысьці,*
*Ды пакліч ганаровых гасьцей"...*
*(Генадзь Бураўкін)*

Канец траўня пачатак чэрвеня стаў асабліва багаты ў віленскім Таварыстве Беларускай Культуры на сустрэчы і розныя мерапрыемствы.

Апошняе было прысьвечанае Леваніду Каралю, у гэтым годзе яму споўнілася б 85. Л.Кароль вучань Віленскай беларускай гімназіі, нашчадак настаўніка гэтай гімназіі, актыўны беларускі дзеяч канца 80-х гадоў мінулага стагодзьдзя. ""У інстытуце электраграфіі працуе беларускі патрыёт",- так сказаў Хведару Нюньку ягоны стрыечны брат, які ў той час працаваў разам з Л.Каралём. У Вільні пачалі ўзьнікаць першыя суполкі, адной зь іх было ТБК, якім кіраваў Хв.Нюнька. Першае знаёмства перарасло ў цеснае сяброўства. Л.Кароль быў добрым дарадчыкам старшыні, пазьней- галоўным карэктарам і аўтарам старонкі "Беларус Віленшчыны", ў таварыстве пачалі выходзіць першыя кніжкі, газета "Рунь". Л.Кароль уваходзіў у рэдкалегію, доўгі час быў салістам хору "Сябрына", дапамагаў у выбары рэпертуару, разам зь ім заўсёды прыходзіла і ягоная жонка. Таварыства атрымала сваё памяшканьне, дзякуючы мэтанакіраваным дзеяньням старшыні, было цяжка. але тады было і цікава. Адраджалася беларускае жыцьцё пасьля амаль 50 гадовага маўчаньня.

На імпрэзе пра Л.Караля расказаў Хведар Нюнька. "Прайшло амаль 10 гадоў, як не стала Леваніда Сымонавіча, а яму замены няма". На імпрэзе прысутнічала жонка Зінаіда Кароль. Напрыканцы паказалі стужку. на якой Л.Кароль паказваў могілкі на Ліпоўцы вучняў і настаўнікаў ВБГ, на Радуніцу я з вучнямі хадзіла і на магілу Л,Караля, яго помняць удзячныя нашчадкі. У траўні споўнілася 40 гадоў з дня заснаваньня гісторыка-краязнаўчага музея ў Дзятлаве, яго заснаваў Міхась Петрыкевіч, доўгі час працаваў дырэктарам, праводзіў экскурсіі, апошнія гады жыцьця жыў у Вільні ў дачкі Сьвятланы Петрыкевіч-Красоцкай, хутка і ў Вільні далучыўся да актыўнай дзейнасьці па адраджэньню беларускай культуры, на колькі дазваляла здароўе прыходзіў у таварыства, у Вільні ён знайшоў апошні прытулак. Пра бацьку расказала Сьвятлана Красоцкая, выступленьне было цікавым, эмацыянальным, зачытала ўрыўкі з артыкула Вольгі Іпатавай. успомніла дзяцінства ў Дзятлаве, сяброўства бацькі з Янкам Брылём і Ул.Калесьнікам, з якім разам вучыўся ў настаўніцкім інстытуце.

У пачатку чэрвеня група актывістаў ТБК ладзіла вандроўку на Гарадзеншчыну. Галоўная мэта падарожжа - сустрэча з Алесям Белакозам, у гэтым

годзе яму споўніцца 80, наведалі музей у Гудзевічах, для нас правёў экскурсію сам заснавальнік музея Алесь Мікалаевіч, гэта для нас было галоўнае, асабіста я Гудзевічы наведала ўжо пяты раз, сюды прыязджаю, як на сьвятыя мясьціны- у Полацак, ці Будслаў. Алесь Белакоз увекавечыў сваіх землякоў. Мы наведалі радзіму Міхася Явара, пахадзілі яго сьцежкамі жыцьця.

Перш чым ладзіць экскурсію адбылося некалькі сустрэч з гісторыкам і краязнаўцам гарадзеншчыны Ул.Хільмановічам, сябрам нашага таварыства. Ён чакаў нас на вакзале ў Гародні, адкуль і пачалася наша экскурсія па гістарычных мясьцінах гораду. Пабывалі ў Каложскай царкве, спаткаліся з паэткай Данутай Бічэль-Загнетавай, у 90-я гады яна прыязджала ў Вільню. першая сустрэча адбылася з беларускай грамадзкасьцю ў палацы прафсаюзаў, таму і на сустрэчы ў Гародні шмат было пытаньняў, успамінаў, прыехалі прыхільнікі яе творчасьці, таму наша сустрэча працягвалася яшчэ доўга на кватэры Уладзіміра Хільмановіча, паэтка падаравала нам свой апошні зборнік вершаў "Ойча наш", у цесным коле цытавалі яе вершы, пазнаёміліся з апошняй кнігай прозы і ўспамінаў Дануты Загнетавай. Гэтым разам мы не заходзілі ў музей Максіма Багдановіча, бо для беларусаў Вільні музей М.Багдановіча ў Гарадні асацыруецца з яго заснавальніцай і дырэктарам Данутай Бічэль. Наша сустрэча была не апошняй, абавязкова адбудзецца прызентацыя яе кнігі, якая пакуль у адзіным экзэмпляры, магчыма ў Вільні, куды яе запрасіў старшыня таварыства. Ён з сябрамі нас гасьцінна прыняў на начоўку.

На наступны дзень наша вандроўка працягвалася па Гарадзеншчыне, Ул.Хільмановіч распрацаваў план маршруту і разам з намі паехаў. Першы прыпынак- вёска Лунна. дзе нас чакаў мясцовы краявед Леанід Карповіч і ён правёў нас па літаратурнай мастоўшчыне і ўсе разам наведалі музей у Гудзевічах. Далей мы паехалі ў Жыровічы, па дарозе заехалі ў Сынкавічы. У Жыровічах сустрэліся з інакам Мікалаем (Алегам Бэмбепям, псэўданім "Зьніч"), пазнаёміліся з выдавецкай літаратурай Сьвята-Усьпенскага Жыровіцкага манастыра. Праехалі праз Ваўкавыск, Слонім, Дзятлава, Ліду - гістарычныя гарады Гарадзеншчыны. Падарожжа адбылося дзякуючы старшыні ТБК Хведару Нюньку, яго намесьніку Валерыю Місюку, які ў гэтым падарожжы быў галоўным кіроўцам. Наша бязьмежная любоў да Радзімы, яе патрыётаў натхняе на вандроўкі па Беларусі, на сустрэчы, знаёмствы. Вярталіся ў Вільню позна вечарам поўныя ўражаньняў, новымі ідэямі, планамі на будучыню.

11 чэрвеня ў Вільні адбылася сустрэча з скульптарам Алесям Шатэрнікам, а 12 чэрвеня сябры ТБК , па ініцыятыве Юрася Гіля, наведалі Сьвіраны - месца нараджэньня Фр.Багушэвіча, адвезьлі 200 кніг беларускіх пісьменьнікаў у савічунскую бібліятэку, якая носіць імя паэта, упарадкавалі тэрыторыю каля дому, дзе вісіць мемарыяльная табліца Фр.Багушэвічу.

**Леакадзія Мілаш,** Вільня, 13 чэрвеня 2008г.

## Пагляды, Разважаньні

# Апазыцыя павінна перагледзець мэты

*Лукашэнка, пры ўсёй эксцэнтрычнасьці і дзікасьці ягоных палітычных манер і мовы, усё ж закладае падмурак, які перажыве ягонае праўленьне.*

Піша **Ян Максімюк**

Мне цяжка прыгадаць каго-небудзь зь лідэраў сучаснай беларускай апазыцыі, хто б не займаў таго ці іншага прыметнага становішча ў палітычным, сацыяльным або культурным жыцьці Беларусі да ліпеня 1994 году, калі да ўлады прыйшоў прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка.

Станіслаў Шушкевіч у той час, калі Лукашэнка пачаў сваю палітычную кар’еру, быў старшынём Вярхоўнага Савету Беларусі, і менавіта Шушкевічаў подпіс стаіць пад пагадненьнямі, якія пазначылі сабой канец Савецкага Саюзу. Лявон Баршчэўскі зь Беларускага Народнага Фронту ў 1991—95 г. быў дэпутатам ВС разам са сваімі паплечнікамі Зянонам Пазьняком і Юрасём Беленькім. Анатоль Лябедзька, лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі, таксама быў дэпутатам ВС таго самага скліканьня. Сацыял-дэмакрат Аляксандар Казулін быў намесьнікам міністра адукацыі ва ўрадзе Вячаслава Кебіча. Другі сацыял-дэмакрат Мікола Статкевіч быў заснавальнікам Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў. Мабыць, толькі Аляксандар Мілінкевіч быў у далукашэнкаўскую эпоху амаль невядомы, займаючы пасады ўнівэрсытэцкага выкладчыка і намесьніка старшыні Гарадзенскага гарвыканкаму.

Праз чатырнаццаць год, пасьля сэрыі маштабных палітычных няўдачаў, мы бачым на чале беларускай апазыцыі практычна тых самых людзей. Але калі чатырнаццаць год таму гэтыя палітыкі маглі мабілізаваць у Менску на вулічныя акцыі пратэсту супраць рэжыму 50 000 чалавек, дык сёньня і 2000 лічацца вялікім посьпехам. «Канфлікт пакаленьняў» паміж апазыцыйнымі лідэрамі-»вэтэранамі» і маладымі беларусамі зьяўляецца адной з істотных прычынаў выключнай слабасьці сучаснай беларускай апазыцыі. Хоць можна таксама сьцьвярджаць, што ня менш важныя прычыны маргіналізацыі апазыцыйнага руху і нават зьвядзеньня яго да ролі савецкага дысыдэнцтва палягаюць у адсутнасьці адэкватнай палітычнай стратэгіі з боку апазыцыі і здольнасьці рэжыму сяк-так патрапляць асноўным патрэбам ды чаканьням моладзі.

### Вера ў Яго Вялікасьць Крызіс

У апошняй онлайн-канфэрэнцыі на радыё «Свабода» Мікола Статкевіч выказаў меркаваньне большасьці беларускіх апазыцыйных лідэраў, заявіўшы, што зьмены ў сёньняшняй Беларусі магчымыя толькі ў выпадку палітычнага крызісу падчас прэзыдэнцкіх выбараў. «Рашучыя дзеяньні

паўтары тысячы дэманстрантаў ва ўмовах, калі ўлада захоўвае субардынацыю, немагчымыя, — сказаў Статкевіч. — Але ёсьць адна ноч у пяць гадоў, калі субардынацыя ўладаў, так бы мовіць, хістаецца. Гэта ноч палітычных цудаў. Гэта — ноч прэзыдэнцкіх выбараў».

Усе апошнія тактычныя крокі апазыцыі адпавядалі гэтаму стратэгічнаму прынцыпу. За час лукашэнкаўскага кіраваньня значныя фінансавыя, арганізацыйныя і інфармацыйныя рэсурсы былі кінутыя апазыцыяй галоўным чынам на тры палітычныя кампаніі — прэзыдэнцкія выбары 2001 і 2006 гадоў, а таксама рэфэрэндум 2004 году, што меў на мэце зьняць для Лукашэнкі абмежаваньне на колькасьць прэзыдэнцкіх тэрмінаў. Выбары ў нацыянальны сход у 2000 і 2004 гадах разглядаліся апазыцыяй як менш важныя, і ўжо зусім ніхто, відаць, не ўспамінае пра кампаніі па выбарах у мясцовыя саветы, якія Беларусь перажывала ў 1999, 2003 і 2007 гадах.

Ня дзіўна, што ў ходзе вышэйзгаданых кампаній па выбарах прэзыдэнта роля маладых актывістаў апазыцыі абмяжоўвалася зборам подпісаў, распаўсюджваньнем агітацыйных матэрыялаў і самае галоўнае — удзелам у вулічных пратэстах. Тым часам іх старэйшыя калегі прымалі рашэньні адносна разьмеркаваньня рэсурсаў і прадстаўлялі Беларусь за мяжой. У апазыцыйнай моладзі практычна не было магчымасьці праявіць уласныя палітычныя амбіцыі. З другога боку, парлямэнцкія і мясцовыя выбары давалі куды лепшыя магчымасьці для разьвіцьця мясцовых палітычных ініцыятываў і набыцьця палітычнага досьведу моладзевымі актывістамі, якія маглі прэтэндаваць на месцы дэпутатаў. Аднак іх старэйшыя калегі былі зацікаўленыя толькі ў сымбалічным удзеле ў такіх кампаніях (асабліва ў буйных гарадах), паколькі лічылі поўнамаштабны ўдзел у парлямэнцкіх выбарах, не гаворачы ўжо пра мясцовыя, пустой тратай часу і сілаў. Такім чынам, канфлікт пакаленьняў у беларускай палітычнай апазыцыі ўсё большаў і большаў — галоўным чынам дзеля сумнеўнай палітычнай стратэгіі, якая аддавала перавагу правядзеньню палітычных зьменаў зьверху перад разьвіцьцём нізавых ініцыятываў.

**Ці прайграе апазыцыя бітву за моладзь?**

Гаворачы прарэпрэсіўны характар лукашэнкаўскага рэжыму, мы павінны выразна ўсьведамляць, што яго апарат падаўленьня скіраваны амаль выключна на патэнцыяльна эфэктыўную антыўрадавую дзейнасьць у пэрыяд буйных палітычных кампаніяў, а таксама на тых грамадзян, якія спрабуюць данесьці «апазыцыйны вірус» да больш шырокіх сацыяльных слаёў. У астатніх адносінах культурнае і інтэлектуальнае жыцьцё Беларусі характарызуецца адноснай свабодай. Прынамсі, дзяржаўны кантроль над «апалітычнай» культурнай ды інтэлектуальнай дзейнасьцю ў недзяржаўным сэктары слабы. Іншымі словамі, жыцьцё ў сучаснай Беларусі далёкае ад затхлай і прыгнятальнай атмасфэры брэжнеўскага СССР.

Існуе цікавая аналёгія паміж палітычным кліматам у сёньняшняй Беларусі і Польшчы пачатку 1980-х, пасьля ўвядзеньня ваеннага становішча і забароны «Салідарнасьці». Польскія камуністычныя ўлады, трымаючы пад пільным наглядам чальцоў і прыхільнікаў «Салідарнасьці», у значнай ступені аслабілі свой кантроль у культурным і сацыяльным жыцьці. Такія двухаблічныя захады ў першую чаргу, відаць, былі закліканыя прадухіліць далучэньне да палітычнай дзейнасьці польскай моладзі ды ізаляваць апошнюю ад уплыву палітычнай апазыцыі. У 1980-я раптам была зьнятая забарона на разьвіцьцё айчыннай рок-музыкі, і стала намнога прасьцей атрымаць замежны пашпарт, каб выехаць за мяжу. Агульнай у той час была думка, што польскія камуністы сьвядома штурхаюць маладых людзей да пошукаў уцехі ў гарэлцы, сэксе, наркотыках і рок-музыцы альбо да эміграцыі — замест уключэньня ў палітычнае ці грамадзкае жыцьцё.

Сучасны беларускі рэжым, як выглядае, імкнецца насьледаваць такому падыходу. Маладыя беларусы, якія хочуць арганізаваць сетку назіраньня за выбарамі, перасьледуюцца паводле артыкулаў Крымінальнага кодэксу аб тэрарызьме, у той час як уступленьне ў прадзяржаўны Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі прапагандуецца праз увесь час іх навучаньня і працоўнай дзейнасьці. У сваю чаргу, вядомыя беларускія рок-музыканты, зьяўленьне якіх на радыё і тэлебачаньні раней было забароненае, нечакана запрашаюцца ў прэзыдэнцкую Адміністрацыю, дзе атрымліваюць прапанову аб «амністыі» наўзамен адмовы ад удзелу ў апазыцыйных мерапрыемствах.

Наколькі пасьпяховая гэтая выбарачная палітыка бізуна і перніка? Некаторыя сацыялягічныя дадзеныя ўскосна паказваюць, што, магчыма, даволі пасьпяховая. Паводле апытаньня, праведзенага ў сакавіку Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД), які цяпер працуе ў Вільні, 64% беларусаў лічаць, што паляпшэньне эканамічнай сытуацыі ў іхнай краіне зьяўляецца больш важным, чым захаваньне незалежнасьці; 24% маюць процілеглае меркаваньне. Пры гэтым сярод рэспандэнтаў ва ўзросьце 18—29 гадоў гэтыя паказчыкі складаюць адпаведна 71% і 22%. НІСЭПД, які праводзіць грунтоўныя апытаньні грамадзкай думкі ў Беларусі двойчы ў год, робіць выснову, што гэтыя дадзеныя сьведчаць пра рост у беларускім грамадзтве «мэркантылізму» і «прагматызму» за кошт «патрыятызму».

Апазыцыя няспынна перасьцерагае, што палітыка Лукашэнкі прывядзе да эканамічнай, а затым і палітычнай анэксіі Беларусі Расеяй, але зьвесткі НІСЭПД паказваюць, што пераважная большасьць беларусаў не перажываюць з гэтай нагоды. Больш за тое, маладыя пакаленьні — сацыяльна больш мабільныя і лепш адукаваныя — здаецца, нават менш заклапочаныя лёсам нацыянальнай незалежнасьці, чым іхныя старэйшыя суайчыньнікі. Чаму?

Першым прыходзіць у галаву адказ, што Лукашэнку сапраўды ўдалося выгадаваць маладых прагматыкаў, якія больш турбуюцца пра свой страўнік, чым пра нацыянальны гонар. Па працяглым разважаньні даводзіцца таксама дапусьціць, што маладыя пакаленьні беларусаў, мабыць, ня лічаць

магчымую страту незалежнасьці за Лукашэнкам, пра якую ўвесь час гаворыць апазыцыя, рэальнай пагрозай для сваёй краіны ці для сябе асабіста. Іх больш хвалюе эканамічны спад, актуальны сёньня для многіх грамадзтваў — як аўтарытарных, так і дэмакратычных. У любым выпадку, зьвесткі НІСЭПД — гэта кепская навіна для апазыцыі з пункту гледжаньня пэрспэктываў пашырэньня яе ўплыву сярод моладзі.

**Патрэбна (як мінімум) новая мова**

Чаму многія маладыя беларусы ўспрымаюць Лукашэнку як дабрадзея, а ня як тырана?

Перш за ўсё таму, што ён прапаноўвае моладзі нешта важнае і каштоўнае для яе ў абмен на палітычны канфармізм. Галоўнымі «падарункамі» рэжыму для маладых людзей зьяўляюцца бясплатная адукацыя, свабода перамяшчэньня (у тым ліку магчымасьць замежных паездак) і ўсё больш прывабныя пэрспэктывы працягу прафэсійнай кар'еры ў Беларусі, паколькі эканоміка павольна, але няўхільна перажывае «аўтарытарную» мадэрнізацыю.

Калі дзьве трацiны беларусаў лічаць наяўную палітычную сытуацыю бясьпечнай і стабільнай, апазыцыі варта перагледзець свае палітычныя мэты — ці прынамсі сваю мову, — калі яна жадае захавацца як уплывовая палітычная група, не гаворачы ўжо пра здабыцьцё тых ці іншых рычагоў у сыстэме ўлады.

Мне здаецца, галоўнай перадумовай такога перагляду павінна стаць прызнаньне з боку апазыцыі, што Лукашэнка, пры ўсёй эксцэнтрычнасьці і дзікасьці яго палітычных манер і мовы, магчыма, усё ж закладае свайго роду падмурак, які перажыве яго праўленьне. Па сутнасьці, гэтым падмуркам зьяўляюцца палітычныя і эканамічныя інстытуты незалежнай дзяржавы. Прынамсі, цяпер ужо нікога ня трэба пераконваць, што сёньняшняя Рэспубліка Беларусь як мінімум ня горшая за ўчарашнюю БССР.

Калі такая пераацэнка адбудзецца, апазыцыйным партыям будзе прасьцей звыкнуцца з думкай, што барацьба за дэпутацкія мандаты ў мясцовых саветах або нацыянальным сходзе — ня менш важная справа, чым удзел у прэзыдэнцкай кампаніі. Беларуская апазыцыя можа паступова пазбавіцца ад сваёй палітычнай зьняверанасьці і паставіць сабе на службу таленты і энэргію ўсё больш прагматычных маладых пакаленьняў, якія хочуць лепшага жыцьця для сябе цяпер, а не для сваіх дзяцей і ўнукаў у прывіднай будучыні.

*Ян Максімюк — аналітык і эсэіст. Нарадзіўся на Беласточчыне, этнічны беларус. Жыве ў Празе.*

Гэтта зьмешчаны артыкул прачытаў аўтар на міжнароднай канфэрэнцыі

**“ЗЬМЕНА ПАКАЛЕНЬНЯЎ? або беларускія адрознасьці ў мэтах, каштоўнасьцях і стратэгіі“** - якая адбылася ў Варшаве 3 - 5 чэрвеня 2008 г.

# НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ ЯК ПРАЦЭС АДРАДЖЭНЬНЯ

***Зянон ПАЗЬНЯК,*** *15 сакавіка 2008 г.*

*Працяг з папярэдняга нумару КРЫВІІ (№9)*

Цяпер, гледзячы з адлегласьці ў 90 гадоў на ўтварэньне, змаганьне і адчайную дзейнасьць уладных структураў Беларускай Народнай Рэспублікі, мы бачым шмат карыснага і павучальнага для цяперашняй беларускай нацыянальна-дэмакратычнай палітыкі. Нават там, дзе ў БНР былі недапрацоўкі ці памылковыя дзеяньні.

Але найбольш значным для нас ёсьць якраз пазытыўны вопыт БНР і гістарычныя вынікі абвяшчэньня яе незалежнасьці.

З пункту гледжаньня наяўнай атрыбутыкі незалежнай дзяржавы, адносна БНР узьнікае шмат скептычнасьці і крытыкі з боку апанэнтаў. Сапраўды, БНР не валодала важнымі атрыбутамі суверэнітэту і дэ-факто не была суверэннай дзяржавай. У БНР не было войска і паліцыі, не было сваіх нацыянальных грошай і фінансавай сістэмы, не было сістэмных структураў мясцовага самакіраваньня, міжнародныя сувязі на ўзроўні амбасадаў былі абмежаваныя і ў пачатковым выглядзе, тэрыторыя знаходзілася пад расейска-нямецкай акупацыяй, дзе дамінавала ўлада і рашэньні акупацыйнага войска.

Аднак, для абгрунтаваньня справядлівасьці і права нашай незалежнасьці, істотнай ёсьць не атрыбутыка суверэннасьці (гэта пытаньне дзяржаўнага будаўніцтва), а тое, што Рада БНР і абвешчаная ёй незалежнасьць БНР валодалі ўсімі чыньнікамі легітымнасьці і выяўлялі суверэнную волю Беларускага народа, якую ён выказаў праз сваіх выбраных прадстаўнікоў на Ўсебеларускім Кангрэсе ў сьнежні 1917 года, дзе і былі сфармаваныя будучыяворганы ўлады.

Беларуская ўлада была сфармаваная ў час чужой вайны на акупаванай чужымі войскамі беларускай тэрыторыі. Пра які суверэнітэт тут магла ісьці гаворка! Тым ня менш, нават у гэтых умовах дзеячы БНР стараліся будаваць дзяржаўныя дачыненьні, ратаваць, берагаць і абараняць свой народ.

Самым вялікім і гістарычным дасягненьнем кароткай гісторыі БНР было тое, што ўпершыню за больш чым сто дваццаць гадоў царскай няволі легальна, моцна, справядліва і законна быў зноў узьняты сьцяг беларускай волі, дзяржаўнасьці і незалежнага існаваньня.

Гэта была вырашальная гістарычная дэкларацыя, падтрыманая народным даручэньнем, якая мела дынаміку і пэрспэктыву рэальнага дзяржаўнага і незалежнага разьвіцьця.

Расейскія бальшавікі якраз добра разумелі гэтую дынаміку і рэальны сэнс аб'яўленьня незалежнасьці БНР. Адразу пасьля акупацыі Менска, у сьнежні 1918 г., яны прыдумалі контрмеры, каб спаралізаваць далейшыя дзеяньні і магчымасьці БНР.

30 сьнежня ў Смаленску на партыйнай канфэрэнцыі Расейскай камуністычнай партыі бальшавікоў было прынятае рашэньне аб стварэньні (у піку БНР)

Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. 1 студзеня 1919 года быў абнародаваны маніфэст ураду ССРБ аб утварэньні гэтай рэспублікі.

З пункту гледжаньня гістарычнай пэрспэктывы факт стварэньня савецкай дзяржаўнай фікцыі меў неадназначныя вынікі. Буфэрная краіна сапраўды дала магчымасьць рускім бальшавікам спаралізаваць і спрафанаваць беларускую нацыянальную ідэю (асабліва ў 30-40-х гадах мэтадам рэпрэсіяў і генацыду насельніцтва). З другога боку, афіцыйнае існаваньне сваёй краіны ("рэспублікі") давала людзям адчуваньне сваёй беларускай тоеснасьці, магчымасьці абмежаванай нацыянальна-культурнай працы і адукацыі, спрыяла прасьцейшым формам народнай салідарнасьці. Аднак палітычныя працэсы разбурэньня беларускага нацыянальнага духа, сьведамасьці і салідарнасьці ў БССР (па прычыне яе рэпрэсіўнай прыроды) значна апярэджвалі спантанныя зьявы беларускай кансалідацыі і народнага патрыятызму. Сістэма БССР – гэта быў шлях у нацыянальную магілу. Структуры квазібеларускай "дзяржаўнай" улады выконвалі якраз нацыянальна разбуральную функцыю. Але ў вызначаны час, калі пачаўся татальны крызіс камунізму і СССР, якраз наяўнасьць гэтых фармальных структураў (парляманту, ураду, мясцовай улады і г.д.) значна аблегчыла нацыянальна-дэмакратычным сілам Беларусі вяртаньне рэальнай дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі.

Такім чынам, утварэньне БССР на мапе Савецкага Саюза можна разглядаць як ускосны вынік стварэньня і абʼяўленьня незалежнасьці БНР. Існаваньне месьніцкай нацыянальна-рэпрэсіўнай БССР з атрыбутамі фармальнай сістэмы ўлады паспрыяла эфэктыўнаму дасягненьню рэальнай незалежнасьці Беларусі ў час нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў жніўні 1991 года.

Аднаўленьне беларускай дзяржаўнай незалежнасьці трэба разглядаць як паэтапны працэс, які пачаўся 25 Сакавіка 1918 года, расьцягнуўся на 73 гады, злучыў змаганьне і жыцьці некалькіх пакаленьняў, які каштаваў беларусам мільённых ахвяраў, вынішчэньня, акупацыяў і генацыду, разбурэньня культуры, здрады і паняверкі.

25 жніўня 1991 года скончыўся этап БССР, этап народнай надзеі і адначасна фікцыі, прафанацыі і ашуканства. Беларусь падтрымала сваю авангардную сілу – Беларускі Народны Фронт – і праз парлямант і ахвярную дзейнасьць там дэпутатаў Апазыцыі БНФ вярнула сабе рэальную незалежнасьць, стала рэальным субʼектам міжнароднага права і міжнароднай палітыкі, валодае ўсімі атрыбутамі суверэнітэту і незалежнай дзяржавы. 25 Жніўня 1991 года для беларусаў, гэтак жа, як 25 Сакавіка 1918 года, ёсьць найвялікшая дата нацыянальнай гісторыі XX-га стагоддзя.

Аднак і змаганьне, і працэс – незакончаныя, нягледзячы на дасягненьне поўнай незалежнасьці Беларусі. Нацыянальная беларуская незалежнасьць прадугледжвае нацыянальную беларускую ўладу. Успомнім схему стварэньня БНР: улада – дзяржава – незалежнасьць. Схема БНФ абапіралася на існаваньне фармальнай дзяржаўнасьці БССР і выглядала так: дзяржава – незалежнасьць – улада.

Незалежнасьць была дасягнута Народным Фронтам у выніку пасьлядоўнай масавай барацьбы і своечасовага, рашучага, дакладнага і беспамылковага выкарыстаньня ў парляманце вострага зьбегу палітычных абставінаў у жніўні 1991 года.

Дасягненьне ўлады дэмакратычным шляхам вымагала тым часам адпаведнага ўзроўню і нацыянальнай кансалідацыі грамадзтва, патрабавала часу на асьвету, сацыяльную палітыку і інфармацыю. Але ўсе рычагі ўлады засталіся ў руках савецкай (і збольшага, антыбеларускай) камуністычнай намэнклятуры. За кароткі час, змагаючыся толькі авангардам грамадзтва з савецкім монстрам улады, пераламаць сітуацыю не ўдалося. Наступны прыход да ўлады ў незалежнай Беларусі прамаскоўскіх і антыбеларускіх сілаў, удзел у беларускай палітыцы агентуры і спэцслужбаў Расеі – усё гэта выглядала цалкам не выпадковым. Антыбеларускія сілы пры дапамозе савецкіх спэцслужбаў Масквы фармальна дэмакратычным шляхам ажыцьцявілі, фактычна, унутраную акупацыю ўлады ў нашай краіне. І перш за ўсё, узьвёўшы на вяршыню гэтай ўлады, прамаскоўска арыентаваную асобу, адметную псіхалягічнай фобіяй да нацыянальнага адраджэньня Беларусі.

Працэс угрунтаваньня нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі і рэалізацыі яе нацыянальнай ідэі ў сапраўднасьці яшчэ працягваецца, бо на сёньняшні дзень (у выніку дзейнасьці антыбеларускай улады і дачыненьняў Масквы) ў Беларусі ня толькі незалежнасьць, але і само існаваньне дзяржаўнасьці, нацыі і беларускай культуры апынулася пад пагрозай дэградацыі і зьнішчэньня.

У гэты крытычны і небясьпечны для будучыні Беларусі момант нашай рэчаіснасьці варта накіраваць свой позірк туды, на 90 гадоў устыч, у той цяжкі час, калі, здавалася, не было паратунку і цела Бацькаўшчыны рвалі на часткі варожыя сілы. І тым ня менш беларускія змагары ўпарта змагаліся за Беларусь у тых неверагодных умовах вайны, акупацыі, голаду і разрухі. Змагаліся і дасягалі. Здавалася, ім нічога не ўдалося рэалізаваць надоўга і незваротна, але яны сваімі дзеяньнямі спраектавалі, пазначылі ўвесь далейшы шлях беларускай барацьбы і беларускага Адраджэньня. Зорка, запаленая імі, -- гарыць.

Антыбеларускую палітыку цяперашняга прамаскоўскага рэжыму на Беларусі і няспынны націск вялікадзяржаўнай Масквы трэба разглядаць як вельмі небясьпечныя зьявы, як пагрозу для незалежнасьці і нацыянальнай культуры Беларусі (культуры, падкрэсьлю, якая стала цяпер, у сучасным сьвеце, чыньнікам нацыянальнага суверэнітэту). Небясьпека агульнанацыянальная. Супрацьстаяць антыбеларускаму рэжыму і агульнай пагрозе нацыі можна (і павінна) шляхам беларускай салідарнасьці. Трэба абараняць нашыя агульныя беларускія каштоўнасьці, і тады салідарнасьць можа злучыць усіх, незалежна ад партыяў і арганізацыяў. Такімі безумоўнымі агульнымі каштоўнасьцямі нацыі ёсьць дзяржаўная незалежнасьць, беларуская мова, беларуская культура, нацыянальны *Бел-Чырвона-Белы сьцяг* і *гэрб "Пагоня"*.

Агульная небясьпека і агульныя каштоўнасьці павінны злучаць усіх беларусаў у абароне свайго, у змаганьні за долю і волю, гэтак, як некалі, 90 гадоў таму, злучалі нашых продкаў пад сьцягам БНР, гэтак, як у легендарным 1991-м, у змаганьні з камунізмам злучылі пад нацыянальным штандарам Беларускі Народны Фронт.

Злучэньне народнай сілы дзеля вырашэньня агульных дэмакратычных і вазвольных задачаў нацыі мусіць даць плён. Скончыцца ганебны рэжым і адчыняцца вялікія пэрспэктывы, аб якіх марылі і за якія пачалі змагацца нашыя далёкія і родныя нам змагары 90 гадоў таму.

## Знак цемнаты

Блог **Сяргея Дубаўца**

У часе наўпроставай трансьляцыі ўрачыстасьцяў у Менску на Першым нацыянальным канале дыктары агучылі патрабаваньні да кандыдатаў у Роту ганаровай варты. Сярод гэтых патрабаваньняў -- "абавязковы славянскі тып твару."

А што гэта такое – славянскі тып твару? Чым і як ён вымяраецца? Нацысты выкарыстоўвалі цыркуль і паказьнікі фізіягноміі. На тое працавалі адмысловыя лябараторыі і дасьледчыя цэнтры. А ўсё для таго, каб усіх, хто не адпавядае арыйскаму расаваму стандарту, адправіць у газэнваген. Увогуле “тып твару” толькі тады і ўсплывае ў гісторыі, калі трэба ўсіх астатніх куды-небудзь адправіць. Напрыклад, “каўказцаў” – з Расеі. Па сваёй сутнасьці выраз “славянскі тып твару” – усяго толькі эўфэмізм, які кожны вайсковец постсавецкай арміі павінен зразумець проста – “чарнажопых” ня браць. І тады ўсё становіцца ясна бяз цыркуля і фізіягноміі.

“Тып твару” – гэта знак цемнаты, зацьменьня розуму. З гітлераўскага і сталінскага мінулага мы ведаем, што расізм недавучак заўсёды цягнецца да глямуру. Менавіта ў мадэльным бізнэсе сёньня пішуць пра моду на “славянскі тып твару”, па сутнасьці маючы на ўвазе тып жаночае красы. Але і тут, дзе жанчын разглядаюць і ацэньваюць паводле зьнешніх прыкметаў, мы ня знойдзем інструкцыі з цыркулем. Усё вызначаецца на вока.

Уладны рэжым РБ даўно гуляе з фашызмам. Пакуль гэта толькі гульня. Інакш, ці засталіся б на сваіх пасадах галоўны дырыжор афіцыёзных канцэртаў, галоўны пісьменьнік ці галоўны рэдактар галоўнай газэты? Зрэшты, увесь уладна-прыўладны бамонд уяўляе зь сябе мешаніну татарскіх, жыдоўскіх, балцкіх і немаведама якіх яшчэ “тыпаў твару”. Маўляў, мы, гульцы, можам быць усякімі, толькі салдацікі павінны быць усе аднолькава алавяннымі.

У гэтай гульні, аднак, якраз сёлета адкрылася страшнаватая падаплёка. Маю на ўвазе апублікаваную гісторыкамі БДУ лічбу стратаў мірнага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі за мінулую вайну. Каля 500 тысяч. Лічба сувымерная афіцыйнай колькасьці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў у БССР (600 тысяч), гэта значыць, тых, каго зьнішчыла НКВД. Дык вось, сярод 500 тысяч жыхароў, забітых у вайну, абсалютная большасьць – на рахунку савецкіх партызан з “большой земли”, іншымі словамі, таксама НКВД.

Вось і атрымліваецца, што фашызм ва ўсіх гэтых паралелях, па вялікім рахунку, і ні пры чым.

**Крыніца:** Радыё Свабода, 3 ліпеня 2008.

## Добрасуседзтва атрымала новы імпульс

***У Брусэлі адбылася Канферэнцыя па еўрапейскай палітыцы добрасуседзтва на Усходзе, арганізаваная Еўрапейскім парламентам. У праграму ўключаны 6 усходнееўрапейскіх краін - Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова, Украіна і Беларусь. У складзе беларускай дэлегацыі Рух “За Свабоду” прадстаўляў Аляксей Кавалец.***

Па словах спадара Аляксея, палітыка добрасуседзтва праводзіцца ў кантэксьце перспектывы магчымага далучэньня шасьці усходнееўрапейскіх краінаў да Еўразвязу а на гэтым этапе ўключэньня ў праграму сумесных дзеяньняў. На канферэнцыі адзначана, што вышэйузгаданыя краіны павінны быць блізкія да Еўропы, уключацца ў еўрапейскую эканамічную палітыку, падзяляць еўрапейскія каштоўнасьці, паважаць правы чалавека.

– Імкненне да гэтага маюць усе гэтыя краіны, акрамя афіцыйнай Беларусі. Але ж дэмакратычныя сілы Беларусі лічаць за стратэгічную мэту далучэньне да аб’яднанай Еўропы, што прывядзе да падвышэньня дабрабыту нашых грамадзян. Менавіта таму яны і прадстаўлялі Беларусь на гэтай канферэнцыі, – кажа Аляксей Кавалец.

Па словах актывіста Руху, на брусельскай канферэнцыі палітыка добрасуседзтва была прадстаўлена больш канкрэтызавана. Абвешчана, што на падтрымку праграмы ў наступным годзе вылучаецца 400 мільёнаў еўра. “Гэта канкрэтная праграма, падмацаваная канкрэтным бюджэтам.”, – адзначыла камісар ў справе зьнешніх сувязяў і палітыкі добрасуседзтва Беніта Фэрэра-Вальднэр. Для параўнаньня, за апошнія сем год на праграму было выдаткавана толькі 700 мільёнаў.

Сродкі будуць накіраваны на паглыбленьне кантактаў на парламенцкім узроўні паміж краінамі-суседзямі і Еўрасаюзам, а таксама з грамадзянскай супольнасьцю, каб спрыяць набліжэньню заканадаўства, палітычных і грамадзкіх інстытутаў краін-суседзяў да еўрапейскіх стандартаў, вырашэньню візавых праблемаў. Плануецца таксама рэалізацыя інвестыцыйных праектаў, сумесных культурных праграмаў, якія будуць праводзіцца з кожнай краінай індывідуальна.

“Палітыка добрасуседзтва павінна выбудоўвацца і вызначацца індывідуальна з кожным удзельнікам, бо менавіта толькі такі дакладны і індывідуальны падыход зьяўляецца залогам яе посьпеху. Менавіта такая палітыка – найлепшы шлях для разьвіцьця шчыльных адносінаў з Еўрасаюзам”, – адзначыў у сваім выступе на адкрыцьці канферэнцыі прэзідэнт Еўрапарламенту Ганс-Герт Пётэрынг.

– На канферэнцыі прынятая заява, якая зьмяшчае асобны пункт адносна Беларусі. Еўрапарламент выказвае расчараваньне, што грамадзяне Беларусі дагэтуль не маюць магчымасьці карыстацца ўсімі перавагамі палітыкі добрасуседзтва па прычыне працягу парушэньня правоў чалавека, палітыкі самаізаляцыі беларускіх уладаў. Еўрапарламент заклікае ўлады неадкладна распачаць дэмакратычныя рэформы і станоўча паставіцца да гатоўнасьці Еўрасаюзу аднавіць дачыненьні зь Беларусьсю ў рамках праграмы добрасуседзтва, як толькі беларускі ўрад прадэманструе павагу да дэмакратычных каштоўнасьцяў і асноўных правоў беларусаў, у прыватнасьці, безагаворкава

вызваліць усіх палітвязьняў, спыніць ціск на незалежныя СМІ і прывядзе выбары ў поўную адпаведнасьць з патрабаваньнямі АБСЕ,– распавядае Аляксей Кавалец.

Па словах Ганс-Герт Пётэрынга, Еўропа за развіцьцё нават з крытычнымі рэжымамі. “Мы будзем рабіць крокі ў напрамку дыялогу і гэтая канферэнцыя - адзін зь іх”, – адзначыў прэзідэнт Еўрапарламенту. Але “палітыка добрасуседства акцэнтуе ўвагу на палітычнай стабільнасьці, замацаваньню дэмакратычных структураў, павазе правоў чалаваека і пабудове рынкавай эканамічнай сістэмы ў краінах-суседзяў”, – заўважыў далей Ганс-Герт Пётэрынг.

Беніта Фэрэра-Вальднэр падкрэсьліла, што Еўропа будзе больш прадуктыўна супрацоўнічаць зь Беларусьсю, калі там адбудуцца зрухі ў бок павагі дэмакратычных каштоўнасьцяў і правоў чалавека.

**Крыніца:** Прэсавая служба Руху “За Свабоду,“ 06.06.2008

# Показкі

**У зубнога лекара:**
**- Вось і ўсё, хворы, вось ваш зуб!**
**- О, дзякуй, дохтар, вось ваша ручка ад крэсла.**

**Дзьве сяброўкі:**
**- У цябе муж жаваранак ці сава?**
**- У мяне муж – мядзьведзь: рана кладзецца, позна ўстае і ўсё роўна нявыспаны...**

**У школе: - Добры дзень, кляса. Я ваш новы настаўнік. Бачу вучняў у вас шмат, усіх усё роўна не запомню. Таму ўсіх хлопчыкаў я буду называць: Эй ты. А дзяўчынак - Зіна.**

**Каб перабіць запах нясьвежых шкарпэтак, экіпаж касьмічнай станцыі вырасьціць на арбіце ўраджай гароху.**

**Беларускія менты, пасьля сыходу на пэнсію ўвесь час рыюцца ў агародзе. І не дзеля ўраджаю, проста не саджаць яны ўжо ня могуць.**

**Гутарка пры ўладкаваньні на працу:**
**- Вы жанаты?**
**- Не, але выконваць загады я навучыўся ў войску!**

**- Ты чуў, як я ўчора сьпяваў? Голас проста не зьмяшчаўся ў залі.**
**- Ня чуў, а бачыў.**
**- Што бачыў?**
**- Бачыў, як людзі выходзілі, каб уступіць тваму голасу месца.**

**КАРА: - Скажы, якая кара за двужэнства?**
**- Ці-ж ты ня ведаеш -- дзьве цешчы!**

## Новыя Кнігі, прэса

**“Магдэбурская Гародня“** -- першая кніга сэрыі ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА, выданьне якой распачаў гарадзенскі Рух “За Свабоду.“

Манаграфія Юрыя Гардзеева “Магдэбурская Гародня“ -- першая ў Беларусі праца, прысьвечаная сацыя-тапаграфіі беларускага горада. Шматгадовая скрупулёзная праца дазволіла аўтару стварыць унікальную для Беларусі кнігу, у якой з усёй магчымай паўнатой апісана разьвіцьцё горада як матэрыяльнага абекта з уваходам у гісторыю амаль кожнага пляца. Гэта запраўды эўрапэйскі ўзровень вывучэньня эўрапэйскай гісторыі беларускага горада.

Запрашаю да чытаньня!

Павал Мажэйка,
каардынатар ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ.




Кнігу можна чытаць - і пазычыць у бібліятэцы беларускай Клюбоўні ў Празе, Soukenická 8, Praha 1

# Крыжаванка



## Пытаньні:

**Па гарызанталі**:

1. Адрыў на вечарыне ці на дыскатэцы. 3. Амэрыканскі бульвар. 5. Сусьветнавядомы віцебскі мастак. 7. У пчалы ў попе. 8. Маленькія бусенкі. 12. Нехта з радні. 13. Чэскі прэзыдэнт. 14. Вышэйшая пасада падчас В.К.Л. 15. Тое, чым цяжка паступіцца. 18. Зьвяртаньне паміж камуністамі. 21. Беларускі агой. 24. Мера вадкасьці ў карчме. 25. За чым нічога няма. 26. Там заўсёды ўсё будзе добра. 27. Ягада. 29. Па статыстыцы ў гэтай краіне людзі адчуваюць сябе найбольш шчасьлівымі. 31. Заходні ўкраінец. 33. Дзьвюма рукамі. 34. Чамадан...Расея. 35. Мера часу. 36. Продкі ірляндцаў. 37. Грашовая адзінка.

**Па вэртыкалі:**

1. – 2. Карыкатурны часопіс у Б.С.С.Р. 3. Таймер. 4. Надзейная аперацыйная сістэма. 5. Бравы салдат. 6. Месца ў Польшчы. 9. Прыбалт. 10. Ужываньне рэчы. 11. На галаве ў сьнегавіка. 15. Сталіца Палесься. 16. Швайцарскі горад. 17. Гаспадар кутоў у хаце. 18. Вальс. 19. Плятуць на Купальле. 20. Любімая прылада прэзыдэнта Беларусі ў спорце. 22. Месца адстойваньня сваіх правоў. 23. У каго галава не баліць. 27. Звычайна ў памяшканьнях там дзе ўваход. 28. Паўночны мох. 29. Культурны цэнтар у старажытнай Беларусі, раённы цэнтар. 30. Каштоўны камень. 31. Песьня ў Нэйра Дзюбеля. 32. Кажуць на беларускім тэлебачаньні.

**Адказы крыжаванкі** будуць зьмешчаныя ў наступным нумары КРЫВІІ - № 11.

# Эўрапэйская Народная Партыя салідарная зь беларусамі

**Эўрапэйская народная партыя асуджае арышты палітычных апанэнтаў у Беларусі і падрыхтавала праект рэзалюцыі аб парушэньнях правоў чалавека.**

“Сітуацыя з дэмакратыяй, правамі чалавека і вяршынствам закону не паляпшаецца, а наадварот, пагаршаецца. Беспадстаўныя арышты актывістаў апазіцыі і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці (уключна з нядаўнім затрыманьнем і судом над А.Мілінкевічам) разам зь ціскам на незалежныя СМІ супярэчыць рыторыцы беларускага ўраду аб яго жаданьні палепшыць стасункі з Еўрапейскім Саюзам,” – гаворыцца ў заяве, распаўсюжанай Еўрапейскай народнай партыяй.

Яцэк Пратасевіч, старшыня парламенцкай дэлегацыі па стасунках з Беларуссю адзначыў: “Абсалютна відавочна, што выкананьне дэмакратычных нормаў зьяўляецца галоўным ключавым момантам ў нармалізацыі стасункаў з Беларусьсю. Пакуль беларускія ўлады трымаюць у турме Аляксандра Казуліна, затрымліваюць і арыштоўваюць прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці і незалежных журналістаў, мы ня можам паверыць у сур’ёзнасьць іх намераў паляпшаць стасункі з ЕС”.

Эўрапэйская дэмакратычная партыя асуджае жорсткія прысуды Сяргею Парсюкевічу і Андрэю Кіму, вынесеныя 22 і 23 красавіка ў Менску за іх удзел у дэманстрацыі прадпрымальнікаў 10 студзеня 2008 года; асуджае затрыманні журналістаў незалежных СМІ, вобшукі ў іх кватэрах, канфіскацыю і псаваньне іх маёмасьці супрацоўнікамі беларускіх спецслужбаў. Таксама выражае вялікае шкадаванне адносна шматразовага злоўжывання сілай органамі аховы парадку Беларусі ў дачыненьні да ўдзельнікаў мірнай дэманстрацыі 25 сакавіка 2008 года ў гадавіну абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі.

“Мы заклікаем беларускія ўлады ўстрымацца ад усіх формаў ужываньня сілы супраць прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі і журналістаў,” – адзначаецца ў заяве.

Зараз самая буйная эўрапэйская партыя падрыхтавала праект рэзалюцыі аб парушэньнях правоў чалавека, дэмакратыі і вяршынства закону, якая будзе разглядацца ў Эўрапэйскім Парламенце.

**Крыніца:** Прэсавая служба Руху “За Свабоду,“ 22.05.2008



## Беларуская школка

У мінулым школьным годзе 2007-2008, беларуская школка ў Празе была змушаная абмежаваць сваю дзейнасьць. Адна прычына - гэта выезд (часам толькі часовы) з Прагі некаторых настаўніцкіх сілаў. Трэба прыгадаць, што 2 гады таму заняткі ў садку для малодшых дзетак праводзіліся рэгулярна й пасьпяхова, асабліва дзякуючы дапамозе нашых стажыстак і студэнтак (асабліва Алі С., Ксені Б. і Сьветы К.).

Дзеля цяжкасьцяў з давозам школьнікаў у памешканьне школы (у Клубоўні) і дзеля некаторых сямейных праблемаў, навука ў вышэйшых клясах (пачынаючы з 2-ой) праводзілая завочна бацькамі (пры дапамозе падручнікаў, падрыхтаваных кіраўніцтвам школы), або “дарэктарскім“ спосабам - г.зн. настаўнікі наведвалі паасобныя сем’і й займаліся зь дзецьмі на месцы.

Зьмест такіх заняткаў такі:
1. Асновы беларускіх правапісаў - кірыліцы й лацінкі, з практыкаваньнямі.
2. Чытанка, 2 часткі.
3. Гутаркі на розныя тэмы штодзённага жыцьця - беларускія выразы.
4. Беларускі Правапіс: правілы й практыкаваньні.
5. Гісторыя Беларусі - з пытаньнямі.

Сёлета некаторыя дзеткі, што раней наведвалі садок, гатовыя ўспрымаць гэтыя больш грунтоўныя веды, а іншыя дзеткі ў міжчасе дасьпелі да беларускамоўнага садка.

Таму надыйшла пара актывізаваць дзейнасьць беларускае школкі ў Празе.

Каб абмеркаваць способы гэтай дзейнасьці, сустрэцца з бацькамі й магчымымі настаўнікамі, у сярэдзіне кастрычніка 2008 будзе скліканы АДМЫСЛОВЫ ШКОЛЬНЫ СХОД. Пра дакладную дату сходу паведамім у наступным нумары КРЫВІІ (№ 11).

## ВІНШУЕМ!

ВІНШУЕМ сямейку Ратнікавых (Шпакоўскага) - Сяржука й Натальлю з нараджэньнем сына ДАВІДА.
Хай-жа жыве Давід на радасьць і карысьць бацьком і беларускай грамадзе!

**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**
Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі
MK ČR E 16919

РЭДАКЦЫЯ
Сяржук Шпакоўскі
Юрка Станкевіч
Ганна Васілевіч

Адрас рэдакцыі:
ul. Soukenická 8, 110 00 Praha 1
Тэл.: 774 873 747, 774 613 356